*Валерый Белакурскі*
*Жанна Белакурская*

# ФЕНОМЕН НАРОДНАЙ МУДРАСЦІ Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Паводле Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, словазлучэнне 'народная мудрасць' абазначае «які мае адносіны да народа, створаны народам» [2, 301], і ў гэтым яго разуменні народную мудрасць патрэбна разглядаць у цеснай узаемасувязі з культурай і нацыянальнымі асаблівасцямі народных мас. Разам з тым, паміж ёю і масавай культурай існуе сур'ёзнае адрозненне. Масавая культура ствараецца для мас, але не створана імі. Таму масавая культура не з'яўляецца натуральным плёнам глыбіннага працэсу народнага жыцця. Яна не здольная сфарміраваць высокія жыццёвыя ўзоры, тыражыруючы толькі тып індывіда-спажыўца, так званага «homo consumens».

Характарызуючы народ як суб'ект традыцыйнай культуры і яе своеасаблівай квінтэсенцыі – народнай мудрасці, мы прытрымліваемся такога пункту погляду, згодна з якім гэты суб'ект увасабляюць працоўныя масы. У гістарычнай рэтраспектыве іх культура праяўляецца пераважна як сялянская, прастанародная, традыцыйная.

Многія сучасныя даследчыкі звязваюць народную мудрасць з рознымі жанрамі вуснай народнай творчасці народа. Патрэбна, аднак, падкрэсліць, што слова «фальклор», якое ўвайшло ў нацыянальны ўжытак у сярэдзіне XIX ст., перакладаецца першапачаткова як «народная творчасць», «народныя веды». Як правіла, у большасці прац заходніх і айчынных вучоных гэты тэрмін распаўсюджваецца на ўсе жанры вуснай народнай творчасці – быліны, казкі, загадкі, песні, замовы, прыказкі і прымаўкі і інш. Больш шырокае разуменне фальклору прадвызначае ўключэнне ў яго артэфактаў не толькі духоўнай, але і матэрыяльнай культуры, такіх, напрыклад, як ганчарная і кавальная справа, ткацтва, вышыйка, разьба па дрэве і інш. У выніку феномен народнай мудрасці паўстае ў выглядзе дастаткова складанай сістэмы духоўных і матэрыяльных утварэнняў, якія бяруць свой пачатак яшчэ з радавога грамадства.

Большасць сучасных навукоўцаў феномен народнай мудрасці схільныя звязваць з глыбокім розумам чалавека, яго багатым жыццёвым вопытам. Гэта непасрэдна ўказвае на тое, што вытокі народнай мудрасці патрэбна шукаць не ў тэарэтыка-пазнавальнай сферы, а ў сферы пазанавуковай, на ўзроўні паўсядзённай свядомасці. Апошняя, выконваючы пазнавальную, светапоглядную, каштоўнасную і іншыя функцыі, выступала як сховішча практычнага вопыту, у якім выяўлялі сябе жыццёва важныя каштоўнасці і нормы. Выкрышталізоўваючыся ў рэчышчы паўсядзённай свядомасці, народная мудрасць уяўляе сабой дастаткова складаны дыялектычны працэс, які абумовіў (у ходзе ажыццяўлення людзьмі разнастайных актаў жыццядзейнасці) назапашванне і замацаванне неабходных для іх і наступных пакаленняў узораў вопыту. Крупінкі гэтага вопыту адбіраліся і шліфаваліся ў свядомасці індывідаў і адпавядалі разумнаму сэнсу большасці людзей, паступова набываючы найбольш выразную і зручную для запамінання форму. Народная мудрасць заявіла пра сябе як аб зборы найважнейшых жыццёвых правілаў, якія тычацца ўсяго ўніверсуму чалавечага быцця, якія не страчваюць сваёй каштоўнасці ў часе, гэта значыць, што яна не толькі засяроджвала ўвагу чалавека на галоўным у эмпірычнай паўсядзённасці, але і давала магчымасць убачыць цэлае і сэнс за ўяўнай дыскрэтнасцю з'яў і падзей, пранікнуць у дыялектычную супярэчлівасць усяго акаляючага. Гэта сведчыла аб здольнасці народнай мудрасці шляхам супастаўлення разнастайных з'яў вылучыць у іх шляхам абстрагавання агульныя прыкметы і адабраць самае істотнае: «Скоры паспех людзям на смех», «Мера – усякаму дзелу вера», «Якой ракой плыць, такой і славай жыць» [1]. Народная мудрасць не толькі стыхійна-дыялектычна адлюстроўвала акаляючы свет, але таксама ўтрымлівала ў сабе ацэнку падзей і з'яў рэчаіснасці: «З вялікай хмары – моцны дождж», «Як наладзіш, так і ўзарэш», «На крутое дрэва трэба круты клін» [1]. Абагульненне тых з'яў і працэсаў быцця, якія адыгрывалі асабліва важную ролю для сацыяльнага суб'екта, узнімала народную мудрасць да вышынь агульначалавечых імператываў. У першую чаргу гэта тычылася сферы маралі. Так, з глыбокай старажытнасці ў народа падвяргаліся асуджэнню жорсткасць, вераломства, прагнасць, зайздрасць, баязлівасць, хлуслівасць і іншыя маральныя заганы: «Не так бойся чорта, як ліхога чалавека», «Завісць не пойдзе ў карысць», «Хто салжэ, таму веры няма». Народная мудрасць супраць настаўляла ім патрабаванні спачування, спагадлівасці, дабрыні, велікадушнасці, сумленнасці: «Шчыраму сэрцу і чужая болька колка», «Літасць да неба даводзіць», «Што сказаў, тое і святое» [1, с. 254, 256, 312]. Усё гэта сведчыць аб тым, што генезіс народнай мудрасці ўяўляе сабой струмень складаных дыялектычных узаемаператварэнняў матэрыяльнага і ідэальнага на аснове грамадскай практыкі. Ідэалізацыя матэрыяльнага выступае ў ёй своеасаблівым перакладам вынікаў практычнага вопыту соцыуму ў рэчышча гранічна сціслых абагульненняў, якія набылі форму прыказак, прымавак, загадак і інш. Матэрыялізацыя ідэальнага, у сваю чаргу, дазваляла членам соцыуму ў далейшым «апрадмечваць» гэтае зерне народнай мудрасці ў новых практычных дзеяннях.

Народная мудрасць, якая ўзнікла і развівалася ў рэчышчы агульных заканамернасцей паўсядзённай свядомасці, у тым яе пласце, дзе выяўляецца тэндэнцыя да пераадолення эмпірыі, не толькі імкнулася да выяўлення новых гнасеалагічных магчымасцей паўсядзённай свядомасці, але і падымалася ў сваіх абагульненнях і высновах над эмпірызмам, імкнулася да фарміравання маральных, этычных, каштоўнасных, светапоглядных і іншых арыенціраў у шматграннай чалавечай жыццядзейнасці. Ісціны народнай мудрасці прапаноўвалі тыя ўзоры, якія прынята называць у народзе сапраўднымі ісцінамі жыцця. У сваёй быццёвасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яны былі неаддзельныя ад праўды: «Праўда добрымі людзьмі жыве», «На людзях праўда праўдзіцца», «Праўду гаворыць не язык, а душа» [1].

Не супадачюы з канкрэтнымі формамі грамадскай свядомасці, такімі, як мараль, філасофія, права, народная мудрасць, аднак, уключала маральныя, філасофскія, эстэтычныя і іншыя элементы грамадскай свядомасці ў сваё сінкрэтычнае рэчышча, праламляючы іх праз прызму разумнага сэнсу і накіроўваючы чалавека на шлях праўды, дабрыні, прыгажосці.

**Спіс літаратуры:**

1. Беларуская народная творчасць. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. – Мінск, 1976. – Кн. 2.
Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Акадэмія навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа; пад агул. рэд. акад. АН БССР К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1979. – Т. 3. – С. 301.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ